Источник: "Краязнаўчая газета" - 2018-03-29

# На тым тыдні...

✓ **21 сакавіка** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага пачала працаваць **фотавыстаўка «Позірк» Леа Ціма** (Мюнхен, Германія). Праект ладзіцца пры падтрымцы Пасольства Французскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 40 працаў фатографа – выхадца з Беларусі. Значная частка твораў выстаўкі прысвечаная Парыжу – гораду, у які імкнуліся ўсе, хто цікавіўся фатаграфіяй з часоў вынаходкі дагератыпіі Жакам Луі Дагерам.

✓ **22 сакавіка** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася **выстаўка «Мы ёсць народам!» (Мітрафан Доўнар-Запольскі)**, прымеркаваная да 100-годдзя з дня абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

Літаратурна-дакументальная частка выстаўкі прадстаўленая хронікай падзеяў, якія адбываліся ў Беларусі ў 1917 – 1919 гг. і ў 1990 – 1991 гг. Яна дае магчымасць прасачыць перадумовы і заканамернасці працэсу нацыянальнага самавызначэння беларускага народа, стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі, узгадаць тагачасную грамадска-палітычную і літаратурную сітуацыю.

Дзякуючы мастаку Алесю Цыркунову мы можам гаварыць пра такіх выбітных асобаў, як Раман Скірмунт, Алаіза Пашкевіч, Казімір Сваяк, Магдалена Радзівіл, Уладзімір Дубоўка, Максім Танк і іншых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, якія адыгралі важную ролю ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці.

✓ **23 сакавіка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася **выстаўка «У любові да роднай зямлі»**, прысвечаная 100-годдзю выдання паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка» і 95-годдзю выдання паэмы «Новая зямля». Годам малой радзімы быў абвешчаны 2018 год, і сімвалічна, што менавіта сёлета адкрылася выстаўка, прысвечаная самым знакамітым паэмам народнага паэта. У экспазіцыі прадстаўленыя ўвасабленні твораў Якуба Коласа ў тэатры, музыцы, кіно.

✓ **25 сакавіка** Іркуцкая беларуская суполка «Крывічы» ладзіла гістарычную вечарыну ў гонар 100-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі. У праграме былі даклады пра падзеі таго часу, прагляд фільма і невялікі канцэрт. Сёлета 25 сакавіка па ўсёй Беларусі і ўсім свеце, дзе існуюць беларускія арганізацыі, прайшлі святочныя канцэрты, гістарычныя вечарыны, сходы і іншыя акцыі, прысвечаныя 100-годдзю БНР.

✓ **27 сакавіка** ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры адкрылася **выстаўка «Свет аўтарскіх лялек»** Сяргея Драздова. Вырабам лялек С. Драздоў пачаў займацца з 2010 года. Усе лялькі – гэта героі казак, піраты, ваяры. Калі майстар паглядзеў сагу «Уладар Пярсцёнкаў», на свет з'явілася цэлая серыя рыцараў. Кожная лялька дапоўненая маленькімі дэталямі (арбалетамі, мячамі, нажамі, пісталетамі), выкаванымі з металу.

✓ **27 сакавіка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пры ўдзеле аўтарскай некамерцыйнай канцэптуальнай галерэі «БРАМА» адкрылася **выстаўка жывапісу Наталлі Камінскай «Асабістае»**.

Што такое асабістае? Гэта выявы ў люстэрку, рэчы, стасункі з блізкімі, таемныя мары. Але для Н. Камінскай перш за ўсё асабістае – гэта непарыўная сувязь з роднымі Смалявічамі, з усімі этапамі і падзеямі яе жыцця ў гэтым горадзе. З 1999 года яна ўзначальвае мастацкае аддзяленне Смалявіцкай дзіцячай школы мастацтваў. Н. Камінская – ініцыятар арт-пленэру педагогаў-мастакоў «Лета ў правінцыі», удзельніца шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных выставак.

✓ **27 сакавіка** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася **прэзентацыя кнігі Інэсы Плескачэўскай «Исторические прогулки с Франциском Скориной»**. Асноваю кнігі сталі журналісцкія матэрыялы аўтара, што друкаваліся на старонках «СБ. Беларусь сегодня» і «Сельской газеты». І. Плескачэўская наведала Кракаў, Падую, Прагу і Вільню, дзе першадрукар вучыўся, жыў і працаваў. У кожным горадзе яна шукала сляды нашага земляка.

У межах сустрэчы адбылося адкрыццё выстаўкі «Францыск Скарына: асоба, дзейнасць, спадчына». На ёй прадстаўленыя выданні, прысвечаныя жыццю і дзейнасці асветніка, у тым ліку найноўшыя навуковыя выданні.

"Краязнаўчая газета". На тым тыдні...